Источник: "Краязнаўчая газета" - 2013-06-27

# Вяртанне Доўнар-Запольскага

У Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі пачала працаваць выстаўка «Мітрафан Доўнар-Запольскі – даследчык гісторыі трох народаў». Яе адкрыццё адбылося 14 чэрвеня, якраз у дзень народзінаў вядомага гісторыка, этнографа і фалькларыста. У мерапрыемстве, арганізаваным установаю сумесна з Музеем гісторыі НАН Беларусі, Інстытутам гісторыі НАН Беларусі, Гомельскім дзяржаўным універсітэтам імя Францыска Скарыны, Санкт-Пецярбургскім філіялам Архіва Расійскай акадэміі навук, бралі ўдзел беларускія даследчыкі, а таксама навукоўцы з Расіі і Украіны.

З экспазіцыяй наведнікаў пазнаёміла Алена Цітавец, загадчыца сектара кнігазнаўства аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў бібліятэкі. Выстаўка складаецца з дзвюх частак: у першай прадстаўленыя дакументы з фондаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН, а ў другой – копіі дакументаў з архіваў Украіны, Расіі і Беларусі. Асобнае месца займаюць кнігі з уласнага кнігазбору М. Доўнар-Запольскага, некаторыя з яго першых публікацыяў у часопісе «Этнографическое обозрение» пачатку 1890-х гадоў, а таксама фотаздымкі самога М. Доўнар-Запольскага з фонду гісторыка Мікалая Улашчыка.

На выстаўцы дэманструюцца матэрыялы Доўнарскіх чытанняў, што ладзяцца ў Рэчыцы – на радзіме Мітрафана Віктаравіча.

Пра дакументы, прадстаўленыя на выстаўцы, расказала дырэктар Музея гісторыі НАН Таццяна Будзянкова. Гэта дакументы, звязаныя з жыццём М. Доўнар-Запольскага ў Кіеве пад час вучобы і ў Мінску, куды вучоны вярнуўся ў 1925 годзе. Пры гэтым у экспазіцыі можна ўбачыць і запрашэнне навукоўцу прыехаць працаваць на радзіму, і пастанову ЦК Кампартыі аб неабходнасці арганізаваць яго ад'езд з Беларусі, што і адбылося восенню 1926 года. Асобна прадстаўленыя лісты нашага земляка і дакументы, звязаныя са спробай абрання яго акадэмікам Расійскай акадэміі навук.

Прадстаўленыя расійскім бокам дакументы наведнікі пабачылі толькі ў дзень адкрыцця выстаўкі, а вось астатнія можна паглядзець цягам месяца.

Напрыканцы прэзентацыі прафесар Арсень Ліс узгадаў словы, сказаныя Доўнар-Запольскім пасля яго прыезду ў Беларусь: «Сапраўды мецъ сваю дзяржаўнасць мы будзем тады, калі будзем ведаць сваю нацыянальную гісторыю». Амаль стагоддзе мінула з таго часу, а гэтыя словы не страцілі свайго глыбіннага сэнсу. Ці рэч толькі ў тым, што гісторыя паўтараецца? Але, прынамсі, сёння гістарычныя памылкі выпраўлюцца, і ў Беларусь вяртаюцца лепшыя яе дзеці.




*А. Цітавец*

***Ніна КАЗЛЕНЯ***
***Фота Міколы ЛІННІКА***

Ніна Казленя. Вяртанне Доўнар-Запольскага